# Школьны веснік



Выпуск 1

Верасень,2016

## Са святам!  Настаўнікі!



### Настаўніку

Стаяць ля маладых гадоў,
Ля чалавечага дзяцінства —
Вялікі гонар, светлы доўг
Настаўніцтва і мацярынства.
Спачатку ў сэрцах прабудзі
Цягу і смагу да асветы,
Пасля — задуманых вядзі
Аж да крыніцы чыстай,
светлай.
На ростані шляхоў-дарог,
Абвеяных паходным пылам,
Народ навекі нам збярог
Крыніцу мудрасці і сілы.
Ты чэрпаць навучы з глыбінь
Жывучую ваду рукою,
Каб наш народ і край любіць,
Мудрэць і харашэць душою.

*Валянцін Таўлай*

Першая нядзеля кастрычніка ў Беларусі — гэта Дзень настаўніка! Для кожнага прадстаўніка прафесіі, звязанай з навучаннем, гэтае свята — адзін з найбольш значных і ўрачыстых. У гэты дзень настаўнікі прымаюць віншаванні ад сваіх выхаванцаў, якія дораць ім кветкі і падарункі, ладзяць канцэрты. Настаўнік — гэта не толькі чалавек, які навучае навукам, але яшчэ і носьбіт духоўнасці і маральнага пачатку. Настаўнікі выконваюць асаблівую грамадзянскую місію — выхаванне маладога пакалення. Іх веды і вопыт, пераемнасць традыцый і наватарства ляжаць у аснове кожнай школы. Мы заўсёды вельмі патрабавальныя да сваіх настаўнікаў. Хочам, каб яны валодалі ўсёй паўнатой ведаў, былі тактоўныя і мудрыя, ветлыя і паблажлівыя. І, вядома ж, жадаем, каб наш настаўнік заўсёды быў у добрым настроі. Пра тое ж, што настаўніку патрэбна наша асабістая падтрымка, часцяком забываем … Але сёння хочацца пажадаць усім настаўнікам добрага здароўя, міру, дабрабыту. А таксама нястомнага пошуку ісціны і ведаў, паразумення ў калектыве і ўдзячных, дапытлівых вучняў!

**Заблоцкая Дзіяна**

# Акцыя «Перазагрузка»

З 10 верасня 2016 года праходзіць месячнік псіхалагічнага здароўя.У рамках месячніка ў школе прайшла акцыя "Перазагрузка" пад дэвізам "Жыццё дзіўнае і займальнае, толькі трэба ўмець заўважаць і здзіўляцца".

Вучні школы актыўна ўключыліся ў работу. Яны падбіралі пазітыўныя фотаздымкі з жыцця класа для таго, каб змясціць на аркушы пад назвай "Перазагрузка".Фотаздымкі размясцілі розныя , разам з тым, арыгінальныя: адпачынак, гульні, дзяцінства, праца, спорт. Кожны вучань школы і класныя кіраўнікі атрымалі "лайкі", якімі пазначалі фатаграфіі, якія спадабаліся. Больш "лайкаў" набраў фотаздымак братоў Яўгена і Івана Гайдукевічаў, якіх маленькіх купаюць ў ванначцы.




Дзецям спадабалася ацэньваць фатаграфіі вучняў другіх класаў і выказалі пажаданні праводзіць такія акцыі.

# Пераможца «Школіяды»



Карысць здаровага ладу жыцця агульнавядомая і вось ужо доўгія гады не падлягае сумневам. Якаснае і збалансаванае харчаванне, моцны сон, пасільная фізічная праца, частыя прагулкі на свежым паветры – усе гэтыя аспекты шмат у чым дапамагаюць ўмацаванню арганізма, спрыяюць маладосці і даўгалецця. Аднак менавіта спорт у жыцці чалавека становіцца найбольш магутным і дзейсным фактарам у справе захавання здароўя. Спорт ўсяляк спрыяе гарманічнаму развіццю чалавека, і ў асаблівасці гэта важна ў маладым узросце. Менавіта таму і хлапчукам, і дзяўчынкам рэкамендуюцца рэгулярныя заняткі спортам з самых юных гадоў, каб яны здолелі аказаць свой дабратворны ўплыў і заклалі добрую аснову здароўя на доўгія, доўгія гады.Заняткі спортам – гэта неад'емны складнік жыцця чалавека, які забяспечвае неабходную актыўнасць. Фізкультура і спорт дораць зарад бадзёрасці і аптымізму, ўмацоўваюць імунітэт і тым самым агароджваюць чалавека ад розных захворванняў.У нашым раёне і школе надзяляецца асаблівая ўвага прыцягненню дзяцей да спартыўных заняткаў. У верасні прайшлі раённыя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы «Школіяда» сярод навучэнцаў 2-4 класаў. Навучэнцы нашай школы прынялі ўдзел у гэтых спаборніцтвах і паспяхова выступілі. Гонар школы абаранялі Дзятловіч Анастасія, Бутрымовіч Павел і Кузьма Аляксандр. Занальны абласны этап спаборніцтва праходзіў у горадзе Смаргонь. Навучэнец нашай школы Бутрымовіч Павел абараняў гонар раёна і вярнуўся з узнагародай. Шчырай віншуем Паўла і жадаем яму далейшых поспехаў, каб у яго спартыўнай скарбонцы быў яшчэ не адзін медаль.

**Мардас В.,вуч.8 класа**

# Абаранялі гонар раёна



У вобласці прайшоў конкурс камп'ютарных гульняў "Стымулятар бою". Конкурс праходзіў у мэтах папулярызацыі тэхнічных відаў творчасці сярод дзяцей і моладзі, развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў. Асноўнай задачай конкурсу была папулярызацыя інфармацыйных тэхналогій і анімацыйных камп'ютарных праграм. Конкурс праходзіў у 2 этапы: раённы – да 19 верасня 2016 года і абласны – 23 верасня 2016 года ў горадзе Гродна. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаліся навучэнцы сярэдняй адукацыі. Конкурс праходзіў па двух узроставых катэгорыях: 9 – 12 год і 13 – 15 год. Кожны ўдзельнік праводзіў 3 баі. У выніку страты пушкі пры атражэнні атакі час спыняецца. Па выніках гульні выбіраліся пераможцы і прызёры ў асабістым заліку.



Наш Ашмянскі раён абаранялі вучні нашай школы: Кузьма Аляксей і Манькоўскі Максім. З усіх раёнаў было 22 удзельнікі. Пераможцам конкурсу стаў Кузьма Аляксей і заняў 2 месца. Аляксей расказаў нам, што было вельмі цікава. Кожны бой прыносіў перамогу для Аляксея. Мы віншуем яго з узнагародай і жадаем поспехаў, таму што гэты конкурс яшчэ будзе прадаўжацца.

**Мардас Надзя,вучаніца 7 класа**



***Жанна Іосіфаўна, Валянціна Іванаўна***-асацыіруюцца ў нас з сонцам, якое выпраменьвае энергію і пазітыў. А гэта вельмі добра, калі настаўнік і вучань – сябры, і паміж імі няма непаразумення.

Паважаныя ***Іван Вікенцьевіч і Франц Іванавіч***! Гледзячы на Вас, кожнаму хлопчыку нашай школы хочацца выпраміцца і стаць падобным на Вас: спартыўным, стройным, вясёлым і музыкальным. І прыгожым – дабавілі дзяўчынкі. Са святам Вас.

Настаўнік – якое моцнае і гучнае гэта слова, як не вымаўляй!.Кожная літара такога кароткага, але гучнага слова ў жыцці кожнага, адлюстроўвае яго строгасць і дабрыню, сардэчнасць і шчырасць у ведах. На дадзены момант, у сценах нашай школы над нашым выхаваннем і навучаннем працуюць, нібы працалюбівыя і клапатлівыя пчолкі, цудоўныя педагогі. Яркая зорачка сярод іх –***Ірына Станіславаўна***.

Прафесія настаўніка патрабуе ад яго любві да дзяцей, вялікага сэрца, мудрасці, ураўнаважанасці. Ен павінен быць прыкладам для дзяцей ва ўсім: у манерах, культуры паводзін, у тым як ён гаворыць, у яго дзеяннях і нават у адзенні.Са святам, ***Ірына Эдвардаўна і Ірына Баляславаўна!*** Гэта пра Вас!

У жыцці наступае момант, калі яшчэ больш пачынаеш цаніць кожнае імгненне свайго жыцця, успамінаючы прошлае і зазіраючы ў будучае. Побач з Вамі, ***Ядвіга Чаславаўна***, нам добра і камфортна. І ў многім нам хочацца быць падобнай на Вас. Са святам, наш любімы класны кіраўнік!

Настаўнік падобны акіяну, у якім многа ўсяго цікавага, а прадмет падобны тайне, якая знаходзіцца на дне акіяна. Маленькія рыбкі – гэта мы, спяшаемся на ўрок да ***Марыны Тадэвушаўны***, каб разам з ёй пагрузіцца на дно акіяна ведаў. З прафесійным святам Вас!

Кожны настаўнік па – свойму ўнікальны. Кагосьці можна параўнаць з мудраю савой, пырхаючай па класе, вас мы , ***Ганна Францаўна***, параўноўваем з шустраю вавёркай, якая рашае самыя цяжкія задачы, “быццам арэшкі лускае! ”

Вельмі хочаца павіншаваць сваю любімую ***Святлану Уладзіміраўну*** са святам Настаўніка. Яна ж для нас – самая лепшая, самая прыгожая, хоць і крычыць на нас. А як жа інакш – мы ж заслужылі. Абяцаем выправіцца.




После лета, после лета
Я лечу на крыльях в класс!
Снова вместе — Коля, Света,
Оля, Толя, Катя, Стас!
Сколько марок и открыток,
Бабочек, жуков, улиток.
Камни, стеклышки, ракушки.
Яйца пестрые кукушки.
— Это — ястребиный коготь.
— Вот гербарий! — Чур, не трогать!
...Я из сумки достаю,
Что б вы думали?.. Змею!
Где теперь и шум и смех?
Словно ветром сдуло всех!





**Додумался...**

Составить предложение
Со словом "МОЛОТОК"
Дошкольник даже может,
А Сидоров не смог!
Он весь урок вертелся,
Измучился и взмок,
И написал:
**На голову свалился молоток!**

## *Школьные приколы*

### Причины опозданий

Во вторник подвела постель –
Не смог я вовремя проснуться.
Позавчера забыл портфель
В нем был банан – пришлось вернуться.
В своих ошибках разобрался,
Сегодня в срок прийти хотел,
Но слишком сильно разогнался
И мимо школы пролетел.






### Во папа дает!

Нашел я папин школьный
Потрепанный дневник
С таблицею футбольной,
С певицею гастрольной,
Страницею с контрольной,
Где жирный кол возник.

И я ходил довольный —
Дневник такой приКОЛьный!

# *Шчырыя словы нашым настаўнікам!*

Быць дырэктарам школы- вельмі адказна. А Вы, сеючы “разумнае, добрае, вечнае ”, паспяваеце яшчэ трымаць давераную Вам установу адукацыі ў чысціні, парадку, ствараючы для навучання ўтульнасць і камфорт. Мы любім сваю школу. Дзякуем Вам, ***Пётр Вікенцьевіч!*** Свята настаўніка – гэта пра вас!

Я разумею, што прафесія настаўніка часта бывае няўдзячнай, і таму хачу сказаць ўсім педагогам **Вялікі Дзякуй** за тое, што вы трацiце сваю душэўную цеплыню на нас! Я часта думаю, якое вялікае і добрае сэрца ў ***Валянціны Паўлаўны***, што яго хапае на нас усіх: паслушных і хуліганаў. Дзякуй вам за гэта.

***Натальля Віктараўна і Наталія Эдвардаўна*** робяць з нас сапраўдных людзей. Яны дапамагаюць нам ісці далей і далей. Заўсёды вераць ў нас, і гэта галоўнае

У нас у школе ёсць прыгажуня – настаўніца. Гэта ***Анастасія Аляксандраўна.*** Яе настрой заўсёды вясёлы і адпавядае ўсмешцы на яе твары. А ў восеньскую пару года Анастасія Аляксандраўна зіхаціць як сонейка. Са святам Вас, і заставайцеся такой заўсёды

***Тацяна Браніслаўна!*** У такі важны для Вас дзень мы жадаем Вам быць заўседы такой чулай, пазітыўнай, прыгожай, такім жа адказным настаўнікам, якім Вы з’яўляецеся. Няхай Ваш талент рабіць школьнае жыцце цікавым – застаецца з вамі назаўседы. Мы вас любім! Са Святам!.

Нялегка ў беларускай школе выкладаць замежную мову. Але ў гэтым і ёсць ваш “шарм”. Вы незвычайная настаўніца. Мы любім Вас і Ваш прадмет, паважаная *Аляксандра Антонаўна* .

Праца стварыла чалавека. Для гэтага, мабыць, у школе і есць такі прадмет – праца. А настаўніца , якая выкладае – вяселая, чалавек з гумарам. Яна нават голас ніколі не павышае, яе ўраўнаважанасць, тактоўнасць, інтэлігентнаць нам вельмі падабаецца. *Альфрэда Зыгмундаўна* – добрая настаўніца.